рые ў зямлі гнёзды, выкарыстоўваюць і норкі павукоў, куды адкладваюць яйцы на паралізаваных уколамі джала павукоў, якія з'уляюцца кормам для лічынак. Лічынка акукліваецца ў норцы.

**ДАРÓЖНЫЯ ЗНА́КІ**, гл. *Знакі дарожныя.*

**ДАРÓЖНЫЯ МАШЫ́НЫ**, комплекс машын і агрэгатаў для выканання *дарожна-будаўнічых работ*, рамонту і утрымання аўтамаб. дарог, пакрыццяў вуліц і плошчаў. Шырока выкарыстоўваюцца таксама ў гідратэхн., прамысл., ч.-г., гар., аэрадромным буд-ве і на інш. інж.-буд. работах. Бываюць самаходныя, навясныя і прычапныя (да *трактароў, цягачоў*, аўтамабіляў).

Д.м. для падрыхтоўчых работ — *карчавальнікі, кустарэзы, каменеўборачныя машыны, рыхліцелі*, дрэвавалы, дзернарэзы; імі ачышчаюць дарожныя палосы ад хмызняку, валуноў, расліннага слоя, рыхляць грунт. Д.м. для земляных работ — *бульдозеры, грэйдэры, грэйдэры-элеватары, канвееры, каналакапальнікі, скрэперы, экскаватары, самазвалы*, грунтакідальнікі і інш. (гл. таксама *Землярыйныя машыны*). Выконваюць работы па адсыпцы насыпаў, распрацоўцы выемак, пракладцы водаадводных канаў, узвядзенні штучных збудаванняў, транспартаванні грунту. Д.м. для ўшчыльнення грунту і пакрыццяў — *каткі дарожныя, трамбавальныя машыны*, вібрапліты і інш. (гл. ў арт. *Вібрацыйная тэхніка*. Д.м. для ўкладкі дарожнага адзення і пакрыццяў — *бетанавозы, бітумавозы, гудранатары, асфальтабетонаўкладчыкі, бетонаўкладчыкі, фрэзы дарожныя, планіроўшчыкі*, грунтазмяшальныя машыны і ўстаноўкі і інш. Д.м. для дарожна-эксплуатацыйных работ — *снегаўборачныя машыны*, палівальна-мыечныя, аўтараманцёры, разметачныя, песка- і солераскідвальнікі, падмятальна-ўборачныя і інш. (гл. ў арт. *Камунальныя машыны*). Ёсць машыны для падрыхтоўкі, вырабу, транспартавання дарожна-буд. матэрыялаў (*драбілкі, дазатары, грохаты, каменярэзныя машыны, бетоназмяшальнікі, пагрузчыкі, пад'ёмныя краны* і інш.).

У Беларусі работы па стварэнні Д.м. вядуць НВА «Белдарбудтэхніка», канцэрн «Амкадор», Магілёўскі аўтамаб. з-д, Мазырскі з-д меліярац. машын, БПА, Магілёўскі машынабуд. ін-т і інш.

*Літ.*: Машины для строительства дорог. 2 изд. М., 1971; Дорожные машины. 2 изд. Л., 1976. *І.І.Леановіч.*

**ДАРÓНІКУМ** (Doronicum), род кветкавых раслін сям. астравых. Каля 35 відаў. Пашыраны ў гарах умераных паясоў Еўропы, Азіі, Паўн. Афрыкі. На Беларусі інтрадукаваны і вырошчваюцца ў садах, парках і на прысядзібных участках 2 віды: Д. усходні (D. orientale) і трыпутнікавы (D. plantagineum).

Шматгадовыя травяністыя расліны з карэнішчам і прамастойнымі простымі або слабагалінастымі сцябламі. Прыкаранёвае лісце яйцападобна-круглаватае, з доўгімі чаранкамі, сцябловае — яйцападобна-эліпсоіднае. Кветкавыя кошыкі дыям. 6—8 см, жоўтыя, адзіночныя або ў шчыткападобных суквеццях. Цвітуць у маі—чэрвені. Плод — сямянка. Дэкар. і лек. расліны, выкарыстоўваюцца для групавых пасадак, у міксбордэрах, на газонах і камяністых горках. Размнажаюць дзяленнем карэнішчаў. *Г.У.Вынаеў.*



Да арт. **Дарожныя восы**. Пампіл дарожны.

**ДАРÓНІНА** Таццяна Васілеўна (н. 12.9.1933, С.-Пецярбург), руская актрыса, рэжысёр. Нар. арт. СССР (1981). Скончыла Школу-студыю МХАТ (1956). З 1959 у Ленінградскім Вял. драм. т-ры, у 1972—83 у Маск. драм. т-ры імя У.Маякоўскага, у 1966—72 і з 1983 у МХАТ імя М.Горкага. З 1987 маст. кіраўнік сцэны на Цвярскім бульвары (з 1989 самаст. т-р, які захаваў назву МХАТ імя М.Горкага) — дырэктар, гал. рэжысёр, маст. кіраўнік. Актрыса моцнага, глыбокага тэмпераменту. Сярод роляў: Надзея («Мая старэйшая сястра» А.Валодзіна; і ў кіно), Настасся Пілілаўна («Ідыёт» паводле Ф.Дастаеўскага), Аркадзіна («Чайка» А.Чэхава), лэдзі Макбет («Макбет» У.Шэкспіра; і рэжысёр). З 1956 здымаецца ў кіно: «Тры таполі на Плюшчысе», «Яшчэ раз пра каханне», «Мачаха» і інш.

**ДАРÓХІН** Уладзімір Васілевіч (н. 1.1.1948, г. Слонім Гродзенскай вобл.), бел. кампазітар, педагог. Засл. дз. маст. Беларусі (1988). Скончыў Ленінградскую кансерваторыю (1973). З 1978 адказны сакратар, з 1986 нам. старшыні праўлення Саюза кампазітараў Беларусі.



**Даронікум** аўстрыйскі.




**Дарожныя машыны**: 1 — аўтабетоназмяшальнік для прыгатавання і дастаўкі бетоннай сумесі; 2 — гусенічны прафілёўшчык для будаўніцтва дарог мясцовага значэння; 3 — гусенічны асфальтаўкладчык; 4 — гусенічная аўтаматызаваная грунтазмяшальная машына; 5 — машына для стварэння ўмацавальных палос; 6 — самаходны нарэзчык швоў; 7 — заліўшчык швоў пры будаўніцтве цэментабетонных пакрыццяў; 8 — маркіровачная машына для нанясення раздзяляльных ліній.